ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫ ЧАСОПІС

08 / 2011

# Народная Асвета

- СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ: КОДЭКС АБ АДУКАЦЫІ
- ІДЭАЛАГІЧНЫ ВЕКТАР: НОВЫ ЧАС, НОВЫЯ ЗАДАЧЫ І СТЫМУЛЫ
- БІЗНЕС-ІНКУБАТАР: «ВЫРОШЧВАЦЬ» ЭКАНАМІЧНАЕ МЫСЛЕННЕ
- ПЕДАГАГІЧНАЯ АСАМБЛЕЯ: ЯКАСЦЬ ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАЎ

**У артыкуле ўпершыню з пазіцыі афарыстычна-жанравага абагульнення аналізуюцца асноўныя ідэі этнапедагогікі беларусаў, раскрываецца сістэмна-педагагічны характар народнай афарыстыкі.**



# АФАРЫСТЫЧНАЯ ЭТНАПЕДАГОГІКА БЕЛАРУСАЎ

## Выхаваўчы сэнс народных парэмій

**В. С. Болбас,**
першы прарэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна,
кандыдат педагагічных навук

**Афарыстычная творчасць беларусаў – найбагацейшая скарбонка філасофскіх, агранамічных, метэаралагічных, медыцынскіх, грамадазнаўчых, педагагічных і іншых ведаў. Прычым, назапашвальна-захаваўчая і пераемнасна-транслюючая функцыі народных афарызмаў пры ўсёй іх важнасці не з'яўляюцца галоўнымі. Асноўнае прызначэнне народных афарызмаў – дапамога засваенню і перадачы з пакалення ў пакаленне культурных набыткаў і жыццёвага вопыту. Таму менавіта педагагічная функцыя народных парэмій з'яўляецца галоўнай, і самі яны выступаюць у якасці дасканалых і эфектыўных выхаваўчых сродкаў – дзякуючы гранічнай лаканічнасці, бязмежнай ёмістасці сэнсу, глыбокай і тонкай паэтычнасці. Тэрміналогія афарызмаў, як і народнай мудрасці ўвогуле, выразна адлюстроўвае мясцовыя дыялекты, тыповыя народныя прыкметы і выразы, а таму робіць традыцыйную педагагічную культуру блізкай і прымальнай для самых шырокіх слаёў насельніцтва.**

### Цудадзейная сіла слова

З сівой мінуўшчыны нашым продкам была вядомая **цудадзейная сіла слова**. Вярбальныя сродкі ўздзейнічаюць на розум і пачуцці выхаванцаў і часта прадвызначаюць асобныя ўчынкі, а то і пэўную лінію паводзін. Невыпадкова сучасныя даследчыкі лічаць, што «найстаражытным і найгалоўным сродкам выхавання, які ўтварыла шматвяковая выхаваўчая практыка народа, з'яўляецца роднае слова» [3, с. 8–9]. У народзе лічылася, што яго ўздзеянне адбываецца не толькі ў час вымаўлення, а і бясконца доўга пасля таго.

Сваю моц і сілу слова асабліва ярка дэманструе ў прыказках і прымаўках, благаславеннях, клятвах, нефігуратыўных выразах і г.д. Схіляючыся перад сілай слова, Мікола Гусоўскі параўноўваў пяро пісьменніка са стралой з лука воіна: «Дзіўнае ўсё ж падабенства: адзінае джала ў пёраў і стрэл, а напоіш хоць злёгеньку ядам – хопіць і драпіны, каб закрануты загінуў» [5, с. 57].

Па-сапраўднаму невычэрпны педагагічны патэнцыял набывае слова ў народных афарыстычных выразах. Яшчэ ў XVII ст. першы айчынны парэміёлаг, філосаф і педагог, ураджэнец Полаччыны Саламон Фёдаравіч Рысінскі больш за 30 гадоў свайго жыцця прысвяціў збору крупінак народнай мудрасці і выдаў кнігу «Польскія прымаўкі, сабраныя Саламонам Рысінскім... васемнаццаць соцень». Слова «польскія» не павінна бянтэжыць сучаснага чытача. Беларусь у той час уваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай, а збіральніцкая дзейнасць вучонага адбывалася на тэрыторыі як сучаснай Польшчы, так і Беларусі. Як адзначае Я.І. Парэцкі, «Рысінскі чуў народную мудрасць на беларускай, запісваў на польскай і тлумачыў на лацінскай мове» [7, с. 44].

Фальклорны зборнік С. Рысінскага хутка набыў папулярнасць і ў іншых краінах. Ян Амос Коменскі, напрыклад, у сваіх навуковых працах плённа выкарыстоўваў здабыткі беларускага калегі. Я. І. Парэцкі зазначаў, што «каля 500 прыказак з 1800, прадстаўленых у першым выданні, захаваліся ў Беларусі да нашых дзён» [7, с. 52]. А сам С. Рысінскі лічыў, што прыказкі і прымаўкі – «ядро і сок» роднай мовы, імі «лягчэй пераканаць большую частку людзей, чым найбольш пераканаўчым словам аднаго, нават вельмі мудрага чалавека» [7, с. 46].

Сістэматычнае ж даследаванне вуснай народнай творчасці беларусаў пачалося толькі

ў XIX ст. Сярод збіральнікаў і даследчыкаў народнай афарыстычнай культуры асаблівага плёну дабіліся такія фалькларысты, як І. І. Насовіч (1788–1877), Я. А. Чачот (1796–1847), А. Ф. Рыпінскі (1811–1900), Я. П. Тышкевіч (1814–1873), А. К. Кіркор (1818–1886), П. М. Шпілеўскі (1823–1861), П. В. Шэйн (1826–1900), Д. Г. Булгакоўскі (1845–1916), М. А. Федароўскі (1853–1923), Е. Р. Раманаў (1855–1922), Я. Ф. Карскі (1860–1931), А. К. Сержпутоўскі (1864–1940), Я. А. Ляцкі (1868–1942), М. Я. Нікіфароўскі (1845–1910), К. К. Атраховіч (К. Крапіва) (1896–1991), Ф. М. Янкоўскі (1918–1984) і інш.

Народная афарыстычная спадчына, як і ўвогуле традыцыйная культура, носіць сінкрэтычны характар. І сам чалавек, і навакольная рэчаіснасць, і ўвесь Сусвет трактуюцца ў ёй як адзінае цэлае. Не на панаванне над прыродай, а на гарманічнае з ёй суіснаванне накіравана маральна-экалагічная сутнасць народных парэмій. Педагагічнае ўздзеянне афарыстычных сродкаў таксама носіць сінкрэтычны характар: яно аб'ядноўвае веды, веру і пачуццёвае перажыванне рэчаіснасці.

Выхаваўчая эфектыўнасць народных афарызмаў абумоўлена кандэнсацыяй у кароткім выразе абагульненасці – шляхам аналізу мноства фактаў і прыкладаў, а потым, пасля абстрагавання, прыпаднясення іх у мастацкай канкрэтнасці. Пераканальнасць, вобразнасць, канкрэтнасць і эмацыянальнасць дасягаецца ў афарыстычных выразах з дапамогай эпітэтаў, гіпербал, алегорый, рытарычных пытанняў і воклічаў. Гэтай жа мэце падпарадкоўваецца выкарыстанне ўсемагчымых сродкаў лексікі, сінтаксісу, марфалогіі, фанетыкі. Усё гэта аб'ядноўваецца кампазіцыйна, рытмічна амаль да ўзроўню меладычнасці, чым дасягаецца яркасць інтанацыйна-сэнсавага гучання афарызмаў. Не ў меншай ступені педагагічная эфектыўнасць іх выкарыстання залежыць ад шматразовасці паўтарэння. Нездарма беларусы лічаць, што *«Кропля камень крышыць не сілай, а як часта на яго падае»* [5, с. 85].

Усе фальклорныя парэміі – вытворныя ад самой прыроды чалавека, раскрываюць сутнасць чалавечай асобы ва ўсёй яе шматграннасці. Народная афарыстыка ўтрымлівае ўсе кампаненты адладжанай народна-педагагічнай сістэмы: мэтавызначэнне, змест выхаваўчага працэсу, прынцыпы, метады, прыёмы, сродкі і формы выхавання.

## Прыярытэт маральных пастулатаў

Аналіз нацыянальнага афарыстычнага багацця дае ўсе падставы сцвярджаць, што беларускі народ на працягу ўсёй сваёй гісторыі **прыярытэтнае месца адводзіў маральнаму выхаванню**. Асноватворныя пастулаты этнічнай педагогікі беларусаў пераконваюць, што *«добрая цнота даражэй за срэбра і золата»*. Выхаванне дабрачыннай, цнатлівай асобы – галоўная мэта этнапедагогікі беларусаў. Нягледзячы на тое, што нашы продкі пакланяліся розуму і мудрасці, дабрыня ў іерархічнай лесвіцы грамадска-значных вартасцей ставілася вышэй. Адукаванасць таксама высока цанілася ў народзе, але ж існавала цвёрдае перакананне, што *«розум без дабрыні – гэта меч у руках вар'ята»*. З усіх маральных якасцей беларусы, перш за ўсё, цанілі:

- любоў да роднага краю (*«Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднае крыніцы»* [6, с. 59], *«З роднага боку і варона мілая»* [6, с. 58], *«Ідзі ў родны край, там – і пад ёлкаю рай»* [6, с. 58], *«Родная зямелька – як зморанаму пасцелька»* [6, с. 59]);
- паважлівыя адносіны да людзей (*«Паважай другіх – будуць і цябе паважаць»* [6, с. 457], *«Лепш паважаць, чым зневажаць»* [З. Я. Кадол, в. Мялешкавічы Мазырскага раёна], *«Шануй людзей, то і цябе пашануюць»* [6, с. 457]);
- добразычлівасць, шчырасць, міласэрнасць, спагадлівасць (*«Не чыні таго другім, што табе не люба»* [6, с. 457], *«Еш хлеб і людзям дай»* [Д. Л. Калацэй, г. Мазыр], *«Шчыраму сэрцу і чужая болька колка»* [6, с. 254], *«Спагадай свет трымаецца»* [Д. Л. Калацэй]);
- самаахвяраванне, схільнасць да спачування, суперажывання (*«Любі другога, як сабе самога»* [6, с. 457], *«Сам жыві і другім давай жыць»* [6, с. 457], *«Памажы каму ў худабе, то дасць і бог табе»* [6,с. 459]);
- цярплівасць (*«Цярпён – спасён»* [6, с. 299], *«Хто цярплівы, той шчаслівы»* [6, с. 299], *«У хаценні жывець цярпенне»* [6, с. 300]);
- памяркоўнасць (*«Без меры няма веры»* [5, с. 76], *«Душа меру знае»* [9, с. 582], *«І гасцей прымаць, то трэба меру знаць»* [5, с. 67]);
- дабрыня (*«У добрага чалавека заўсёды многа добрых людзей»* [6, с. 254], *«Ад добрага чалавека вада даражэй, чым мёд ад кепскага»* [6, с. 64], *«Добраму ўсюды добра»* [5, с. 81]);
- праўдзівасць, сумленнасць (*«На праўдзе свет стаіць»* [5, с. 155], *«Праўда грубая, ды людзям любая»* [5, с. 156], *«Праўда на агні не гарыць і ў вадзе не тоне»* [5, с. 156], *«Праўдаю надалей дойдзеш»* [5, с. 156]);
- сціпласць, стрыманасць (*«Не той моцны, хто стрымлівае коней, а хто стрымлівае сябе»* [М. П. Тамашова, в. Каменка Мазырскага раёна]);
- гасціннасць (*«Госьць у дом, Бог у дом»* [10, с. 201], *«Прымі падарожнага – сам будзеш у дарозе»* [М. П. Тамашова], *«Хата гасцямі багата»* [З. Я. Кадол]).

Асноўным крытэрыем маральнасці ў беларускага народа заўсёды было стаўленне чалавека да працы: *«Душу і сэрца ў работу ўкладзі, кожнай секундай у працы даражы»* [5, с. 81], *«Работа не бясчэсціць, а крэпіць і цешыць»* [5, с. 95], *«Хто аддае ніўцы, што яна родзіць, той да суседа па хлеб не ходзіць»* [5, с. 102].

Беларусам уласцівы ашчаднасць, беражлівасць (*«Гаспадарлівы не надта раскінецца»* [5, с. 78], *«Запас бяды не чыніць»* [5, с. 82], *«Курачка па зярнятку збірае і сытая бывае»* [5, с. 86]), акуратнасць (*«З адкладу няма ладу»* [5, с. 81], *«Рабі пільна, то і дома будзе Вільня»* [5, с. 95]), упартасць у пераадоленні цяжкасцей (*«Тое дарага, што нялёгка даецца»* [5, с. 99]).

Народная мудрасць не толькі садзейнічала выхаванню станоўчых рыс і якасцей, а і надавала вялікую ўвагу раскрыццю такіх чалавечых заган, як:

- гультайства, лянота (*«Гультайства горш за хваробу»* [5, с. 166], *«Гультайства і лянота – два сябры, адзін без аднаго жыць не могуць»* [5, с. 262], *«Гулі не аднаго ў лапці абулі»* [5, с. 262], *«Да работы не мае ахвоты, ляжыць на печы, выграе плечы»* [5, с. 262]);
- п'янства (*«Ад гарэлкі будзе розум мелкі»* [5, с. 338], *«Гарэлка людзей з поля зводзіць»* [5, с. 338], *«Хваробу сабе купіў за свае грошы»* [5, с. 342]);
- хлуслівасць, ашуканства (*«Каб не салгаў, дык бы і не жыў»* [5, с. 308], *«Яму схлусіць – як пярынку спаліць»* [5, с. 319], *«Абманіў – то сабе горш зрабіў»* [6, с. 313]);
- самахвальства, балбатунства (*«Аржаная каша сама сябе хваліць»* [5, с. 305], *«Жаба квокча, сваё балота хваліць»* [5, с. 307], *«Балбатні за яслі ці ў цэбар не накладзеш»* [5, с. 305]);
- зайздрасць, сквапнасць (*«Ад зайздрасці не паразумнееш і не падужэеш»* [5, с. 287], *«Завіднаму чужая бяда як цукар»* [5, с. 290], *«Скупы два разы гіне»* [5, с. 295]);
- сварлівасць, уедлівасць, прыдзірлівасць (*«Ад сварак не баліць карак»* [5, с. 287], *«Верціць языком, як сабака хвастом»* [5, с. 288], *«І за шчэпку знойдзе прычэпку»* [5, с. 290]);
- пляткарства (*«Пляці пакуль не запляцешся»* [6, с. 390], *«Людзі сплятуць смалену кабылу»* [6, с. 393], *«Скажаш слова, а даложаць дзесяць»* [6, с. 393]).

Відаць, няма такой адмоўнай з'явы ў жыцці, якая б не крытыкавалася ў прыказках і прымаўках. З выхаваўчага пункту гледжання тут утрымліваюцца і перасцярога ад развіцця заганных схільнасцей і пабуджальны матыў для іх выпраўлення. Важна адзначыць, што ў народнай педагогіцы абгрунтоўвалася слушная думка аб тым, што як станоўчыя маральныя якасці моцна звязаны адна з адной, так і заганы. Так, сквапнасць нараджае зайздрасць, а разам яны могуць прывесці і да злачынства. *«Хто ілжэ, той і крадзе»* [В. К. Ярашэвіч, г. Мазыр], *«Кажан гультай і злодзей»* [З. Я. Кадол], – катэгарычна лічылі ў народзе.

Аналіз народнай афарыстычнай творчасці беларусаў дае падставы меркаваць аб скіраванасці нашага народа да абшчыннасці, супольнасці, калектывізму: *«Грамада – вялікі чалавек»* [5, с. 61], *«Калі робіш укупе, не баліць у пупе»* [5, с. 62], *«Рой гару павярнуў»* [5, с. 62].

Са старажытных часоў значэнне аднаго чалавека ў параўнанні з грамадой практычна ігнаравалася: *«Адзін у полі не воін»* [5, с. 61], *«Адным колам плоту не падапрэш»* [5, с. 55], *«Адна галавешка не гарыць, а толькі тлее»* [5, с. 61], *«Адною рукою і вузла не завяжаш»* [5, с. 61]. У той жа час народныя парэміі адлюстроўваюць дынаміку культурна-гістарычных працэсаў, у прыватнасці пад уплывам заходнееўрапейскай маралі на землях Бацькаўшчыны паступова пачынаюць сцвярджацца ідэі індывідуалізму: *«Гаспадар на сваім агародзе – роўня ваяводзе»* [5, с. 78], *«Яшчэ той не радзіўся, каб усяму свету дагадзіў»* [Д. Л. Калацэй].

Невыпадкова сучасныя навукоўцы тыповага беларуса ў параўнанні з заходнімі суседзямі называюць калектывістам, а ў параўнанні з усходнімі – індывідуалістам. Такім чынам можна зрабіць вывад, што ў беларусаў назіраецца спроба сінтэзу, гарманізацыі інтарэсаў грамадства і асобы. Узровень духоўнай дасканаласці асобы правяраецца выкананнем залатога правіла маралі, якое з вуснаў беларускага народа гучыць так: *«Усё, што сабе не міла, другому не зыч»* [6, с. 457].

Многія навукоўцы адзначаюць, што для беларусаў адметныя адсутнасць гардыні і наяўнасць хрысціянскай любві і пакорлівасці [11, с. 33]. Небеспадстаўна ў якасці характэрнай рысы нашых продкаў называюць набожнасць. Народная афарыстыка падмацоўвае падобныя высновы: *«Без Бога не да парога»* [6, с. 149], *«Бог усё бачыць»* [М. П. Тамашова], *«Скінь шапку, Бог у хаце»* [6, с. 150]. Да Бога звярталіся штодзённа і ў радасці, і ў горы: «Дзякуй Богу», «Дапамажы, Божа». Народная мудрасць перасцерагае: *«На Бога спадзявайся, але і сам старайся»* [6, с. 155], *«Нікому з неба само не спадзе»* [Т. П. Гусак, в. Іванкаўшчына Мазырскага раёна]. У народзе з даўніх часоў выкананне хрысціянскіх запаветаў часта вызначалася адносінамі асобы да іншых людзей. *«Хто людзей не саромеецца, той Бога не баіцца»* [7, с. 148], – сцвярджалася ў адной з прымавак, запісаных у XVII ст.

**(Працяг будзе)**

09 / 2011

# Народная Асвета

ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫ ЧАСОПІС



- ☑ **СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ:**
  **МЕДЫЯАДУКАЦЫЯ: НОВЫ ДЫЯЛОГ СА СМІ**
- ☑ **САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫ ФОРУМ:**
  **БЕЛАРУСЬ НА ГЕАПАЛІТЫЧНАЙ АРЭНЕ**
- ☑ **ПЕДАГАГІЧНАЯ АСАМБЛЕЯ:**
  **ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ – ПРЫЯРЫТЭТ ДЗЕЙНАСЦІ**
- ☑ **БАЦЬКОЎСКІ СХОД:**
  **КАМП'ЮТАРНАЯ ЗАЛЕЖНАСЦЬ ШКОЛЬНІКАЎ**

# АФАРЫСТЫЧНАЯ ЭТНАПЕДАГОГІКА БЕЛАРУСАЎ

## Выхаваўчы сэнс народных парэмій

**(Працяг. Пачатак у № 8)**



**В. С. Болбас,**
першы прарэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна, кандыдат педагагічных навук

### Праца як вiток самазацвярджэння

У народнай афарыстыцы бадай самае шырокае ўвасабленне знаходзіць **працоўная тэматыка**. Многія даследчыкі ўвогуле народную педагогіку беларусаў называюць педагогікай працы. Важна адзначыць, што пры выхаванні працавітасці як станоўчай чалавечай якасці адмоўную ацэнку атрымлівала руплівасць чалавека толькі дзеля ўласнай выгоды, асабліва за кошт ушчамлення інтарэсаў іншых.

Можна сцвярджаць, што беларусы імкнуліся з маленства сфарміраваць у сваіх дзецях адпаведную матывацыю, абудзіць цікавасць да працы не толькі як крыніцы існавання, але і вытоку самасцвярджэння, псіхалагічнай задаволенасці, натхнення («*Хто змоладу не працуе, той на старасць жабруе*» [6, с. 268], «*Хочаш быць шчаслівым – не будзь лянівым*» [З. Я. Кадол], «*Дзе няма ахвоты, там няма работы*» [5, с. 80]). Змест працоўнага выхавання ўключаў фарміраванне станоўчых, творчых адносін да працы, імкненне да самаўдасканалення, трывалы навык працоўных дзеянняў, якаснае і адказнае выкананне працоўных даручэнняў, уменне падпарадкоўвацца калектыўным інтарэсам і клапаціцца пра іншых у працэсе працы: «*Без працы не будзеш есці калачы*» [5, с. 76], «*Для здаровага чалавека праца лепшы доктар*» [5, с. 81], «*Не ад адной хваробы праца – найлепшыя лекі*» [5, с. 90].

Працоўнае выхаванне было цесна звязана з рамяством, навучаннем дзяцей бытавым, працоўным, агратэхнічным ведам, уменням і навыкам: «*Рамяство плячэй не абцягвае*» [5, с. 96], «*Слуцкія ткачыхі могуць увесь свет спавіць*» [5, с. 97]. Перадача медыцынскіх, метэаралагічных, батанічных і матэматычных ведаў ажыццяўлялася ад бацькі да сына, ад маці да дачкі. Адбывалася як навучанне канкрэтным працоўным аперацыям, так і абагульненай жыццёвай мудрасці: выкарыстанне народных прыкмет надвор'я, назіранне за развіццём раслін і жывёл, вызначэнне тэрмінаў сельскагаспадарчых работ, збору дзікарастучых раслін: «*Багата снегу – багата хлеба*» [5, с. 76], «*Бяроза распускаецца – сей авёс, сады цвітуць – бульбу, каліна цвіце – грэчку*» [5, с. 77], «*Глыбей узарэш – болей збярэш*» [5, с. 78], «*Да Міколы не сей грэчкі, не стрыжы авечкі*» [5, с. 79], «*Дзяцел дзяўбе ў сцяну – мяцеліца будзе*» [5, с. 81], «*Жураўлі ляцяць высока – зіма яшчэ далёка*» [5, с. 81].

Дзякуючы афарыстычным сродкам з пакалення ў пакаленне перадаваўся вопыт агульнай арганізацыі працы («*Да ўсякага дзела заўчасна гатоўся*» [Д. Л. Калацэй]), неабходнасці яе мэтавызначэння («*Перш чым запрагаць – ведай чаго і куды ехаць*» [5, с. 198]), важнасці добрага пачатку («*Кожны пачатак цяжкі*» [5, с. 88], «*Крыва пачаў – крыва і будзе*» [5, с. 192]), зацікаўленасці ў дадзенай працы («*Прымусовая работа самая цяжкая*» [5, с. 95]), характару яе выканання («*Скоры спех курам на смех*» [В. К. Ярашэвіч]), тэрмінаў працякання працоўных працэсаў («*Вясенні дзень год корміць*» [Д. Л. Калацэй], «*Кончыў дзела – гуляй смела*» [Д. Л. Калацэй]), узнагароды за працу («*Набытая мазалём капейка перацягне лёгкі рубель*» [5, с. 89]) і інш.

Асаблівая ўвага надавалася неабходнасці авалодання працоўнымі навыкамі. Падкрэслівалася, што без умельства, якое прыходзіць у выніку вучобы і выканання адпаведных практыкаванняў, нельга атрымаць добрага плёну («*Дзе сілаю не зробіш, то спосабам*» [5, с. 80], «*Хто рабіць бярэцца, той і вучыцца*» [Т. П. Гусак], «*Без навукі і лапці не спляцеш*» [Т. П. Гусак]). У афарыстычных творах можна знайсці канкрэтныя парады па арганізацыі любых відаў працы: у земляробстве («*Днём раней пасееш – тыднем раней збярэш*» [5, с. 81], «*Авёс кажа: кінь мяне ў гразь, то будзеш князь*» [5, с. 75], «*Без гною ці без лубіну хлеба не чакай*» [5, с. 76], «*Глебу ўгноіш – ураджай падвоіш*» [5, с. 78]), у жывёлагадоўлі («*Дай свінні больш кукурузнага зярна, хутчэй сала наросціць яна*» [5, с. 79], «*Дай кароўцы бурачка, дасць кароўка малачка*» [5, с. 79], «*Кармі парсюка мукою – пойдзе

*рукою»* [5, с. 85]), у ткацтве (*«Добрая ткаля пры кроснах стагнаць не будзе»* [5, с. 81], *«На тонку сарочку трэба доўга пасядзець, а на белу – трэба доўга пастаяць»* [М. П. Тамашова], *«Лішняя нітка палатну завада»* [М. П. Тамашова]).

## Навука вочы адчыняе

Досыць грунтоўна прадстаўлены ў афарыстычнай творчасці **адносіны беларусаў да ведаў, асветы, пісьменнасці**. *«Навука вочы адчыняе»* [6, с. 176], *«Навука – добрая штука»* [6, с. 177], *«Навука – не мука»* [6, с. 177]. Падкрэслівалася істотная роля кнігі: *«Дзе розумам не дайду, дык у кніжцы знайду»* [6, с. 183], *«Кніга – маленькае акенца, ды праз яго ўвесь свет відзён»* [6, с. 183]. Даваліся дыдактычныя парады ў арганізацыі набыцця ведаў: *«Хочаш многа знаць – трэба мала спаць»* [6, с. 178], *«Вучыцца – не ляніцца»* [6, с. 178], *«Як многа чытае, то многа знае»* [6, с. 183].

У народнай педагогіцы развіццё эмацыянальнай сферы, **далучэнне да прыгожага** адбывалася ў працэсе эстэтычнага выхавання сродкамі прыроды і народнай творчасці. Прыгажосць станавілася неад'емнай састаўляючай жыцця дзіцяці, якое гадавалася ў атмасферы народнага мастацтва, з першых дзён жыцця ўбіраючы ў сябе яго багатую вобразнасць. *«Дзеўка без касы не мае красы»* [5, с. 175], *«Прыбяры пень, дык і пень будзе харошы»* [5, с. 177], *«Як лахудра, то не паможа і пудра»* [5, с. 286]. Змест эстэтычнага выхавання ў этнічнай педагогіцы беларусаў ахопліваў многія аспекты, быў шматфункцыянальным і прадугледжваў веданне асноўных эстэтычных цыклаў народнай творчасці, засваенне народнага этыкету, авалоданне ведамі і навыкамі ў галіне народных рамёстваў: *«Прыпеўкі болей каштуюць, чым сама справа»* [5, с. 198], *«Дай мазі ў кола, а працы – песні вясёлай»* [6, с. 192], *«І ў працы і ў танцы»* [5, с. 176].

Асаблівую ўвагу афарыстычныя сродкі звярталі на ўменне бачыць унутраную прыгажосць рэчаў і з'яў, перасцерагалі, што «не ўсё золата, што блішчыць»: *«На галаве строй, а ў хаце хоць з лапатаю стой»* [5, с. 125], *«Не глядзі на мяне, на фэст ідучы, а глядзі на мяне, лён тручы»* [5, с. 126], *«Апрануты як пава, але брыдкая слава»* [5, с. 174].

Юнакі, мужчыны маглі праявіць свой эстэтычны талент у засваенні працоўных працэсаў: аранні, касьбе, занятках народнымі рамёствамі (разьба па дрэве, цяслярства, лазапляценне, бондарства, кавальства), цесна звязаных з народным мастацтвам. Да эстэтычна значных відаў жаночай працы можна аднесці ўменне ткаць, прасці, шыць, плесці карункі, вышываць, гатаваць стравы нацыянальнай кухні, выхоўваць дзяцей згодна з правіламі народнага этыкету. Традыцыйна жаночымі лічыліся ўсе работы, звязаныя з вырошчваннем і апрацоўкай лёну, прадзеннем кудзелі, бяленнем палотнаў. Няўмельства падвяргалася з'едлівай крытыцы: *«Ні людзям паказаць, ні самому пaглядзець»* [5, с. 280], *«Няўмелай танцорцы і муха заваджае»* [5, с. 281], *«Ні шавец, ні кравец, ні каваль, ні стругаль, а проста гаварыльшчык»* [5, с. 281].

Сур'ёзная ўвага засяроджвалася народнай афарыстыкай на **ролі фізічнага здароўя** ў развіцці асобы. *«Пі халодную воду, не будзеш хварэць да роду»* [6, с. 212], *«Сон лепш усялякага зелля»* [6, с. 212], *«Глянуўшы ў твар, не пытайся пра здароўе»* [5, с. 175].

**Экалагічнае выхаванне** мела на мэце фарміраванне адказнасці за захаванне навакольнага асяроддзя. Бачанне ў прыродзе раўнапраўнага суб'екту ўзаемадзеяння забяспечвала на фізічным і духоўным узроўнях цэласнае, гарманічнае суіснаванне. Таму правілы адносін да прыроды вызначаліся строгай катэгарычнасцю: *«Забіць бабра – ня будзя дабра»* [10, с. 42], *«Дзе бусел, там і шчасце»* [5, с. 80]. Таму ўсе праявы прыроды маюць душу, характар, нораў і звычкі. І клопаты пра прыроду не ўяўляліся інакш чым клопатамі пра сабе: *«Не трэба салавейку залатая клетка, а трэба салавейку зялёная ветка»* [В. К. Ярашэвіч], *«На моцным дрэве заўсёды лісце пазней трымаецца»* [В. К. Ярашэвіч].

Разгляд афарыстычнай творчасці беларусаў паказвае, што акрамя змястоўна-сутнаснага напаўнення выхаваўчага працэсу нашымі продкамі на працягу многіх вякоў была створана адладжаная сістэма патрабаванняў да практычнай арганізацыі выхавання.

## Асноватворныя прынцыпы

Цесная злучанасць народа Беларусі з прыродай абумовіла размяшчэнне ў падмурку ўсёй народна-педагагічнай сістэмы **прынцыпу прыродазгоднасці выхавання**, які адлюстроўваў арганічную сувязь, злітнасць чалавечага існавання з жывой і нежывой прыродай. Аналіз народнай афарыстыкі прыводзіць да высновы, што прынцып прыродазгоднасці выхавання з'яўляецца асноватворным, сістэмаўтваральным. Практычна ўсе іншыя прынцыпы, а таксама метады, сродкі і нават выхаваўчыя мэты выводзяцца з яго. Патрабаванні гэтага прынцыпу пабудаваны на самой сутнасці чалавечай прыроды, на ўмовах чалавечай жыццядзейнасці, на асэнсаванні натуральнага прызначэння месца чалавека ў навакольным асяроддзі і ўвогуле ў Сусвеце.

У народзе было прыкмечана, што на развіццё асобы істотна ўплывае **фактар спадчыннасці**.

*«Якая матка, такое і дзіцятка»* [5, с. 141], *«Якое дрэва, такі клін, які бацька, такі сын»* [5, с. 141], *«На вярбе грушы не растуць»* [З. Я. Кадол].

Прытрымліванне прынцыпу прыродазгаданасці выразна праяўляецца пры арганізацыі выхавання ў адпаведнасці з прыродай дзіцяці. Маецца на ўвазе **пола-ўзроставая стратыфікацыя выхаванцаў і ўлік іх індывідуальных асаблівасцей**. Вельмі яскрава сведчыць аб гэтым наступная прымаўка: *«Да пяці год пястуй дзіця, як яечка, да сямі пасі, як авечку, тады выйдзе на чалавечка»* [5, с. 116].

З самага нараджэння прынцыпова па-рознаму арганізуецца выхаванне хлапчукоў і дзяўчынак. Калі першых рыхтавалі да вядучай ролі мужа, руплівага і дбайнага гаспадара (*«Гаспадар – галава ў хаце»* [5, с. 116]), то другіх да ролі паслухмянай, працавітай жонкі (*«Хата гаспадыняю красна»* [5, с. 137], *«Бог даў жонку, як мурашачку»* [5, с. 114]). У мужчын высока цаніліся якасці, што грунтаваліся на волі, фізічнай сіле, спрытнасці, умельстве – цвёрдасць характару, адпаведнасць слоў і спраў, прыстойнасць, сумленнасць, пачуццё ўласнага гонару і інш. У жанчын на першы план вылучаліся дабрыня, сціпласць, цнатлівасць, стрыманасць, паслухмянасць і інш.

Народная педагагічная мудрасць звяртае таксама ўвагу і на тое, што побач з агульнымі адметнасцямі дзяцей пэўнага ўзросту існуюць індывідуальныя асаблівасці, якія не заўсёды ўпісваюцца ў звыклыя жыццёвыя ўяўленні: *«Не роўны лес, не роўныя людзі»* [Д. Л. Калацэй], *«Кожны чалавек па-свойму жыве»* [Д. Л. Калацэй], *«На крутое дрэва – круты клін»* [5, с. 193].

У народзе была дакладна сфарміравана ідэя, што выхаванне дзяцей павінна пачынацца як мага раней: *«Гні галінку, пакуль маладзенькая»* [5, с. 116], *«Тады дзяцей вучаць, як каля лаўкі ходзяць»* [5, с. 134], *«Што ў маленстве выхаваеш, на тое ў старасці абапрэшся»* [5, с. 140].

У любога народа, і беларусы тут не выключэнне, значная частка вусна-паэтычнай творчасці грунтуецца на каляндарна-абрадавай дзейнасці. Усведамленне арганічнай злучанасці з прыродай, успрыманне чалавека ў якасці яе састаўной часцінкі садзейнічала правядзенню прамых аналогій паміж асобнымі прыроднымі працэсамі і выхаваннем дзяцей: *«Гукні на лес, то і лес адгукнецца»* [Д. Л. Калацэй], *«Па кветках яблыкаў не лічы»* [5, с. 255], *«Не ўсякая мука хлебам стане»* [Д. Л. Калацэй], *«Лішняга і свіння не есць»* [М. П. Тамашова].

Як правіла, выхаванне не адасаблялася як самастойны, спецыяльна арганізаваны працэс, а арганічна ўпляталася ў шматбаковыя грамадскія адносіны і паўсядзённы побыт. Дзеці не столькі рыхтаваліся да будучага дарослага жыцця, колькі паступова пераходзілі ў яго шляхам ускладнення іх сацыяльнай ролі. **Прынцып сувязі выхавання з жыццём** забяспечваў гадаванне дзяцей у непарыўным адзінстве з гістарычнымі, этнічнымі і рэгіянальнымі культурнымі працэсамі. Пастулаты народнай мудрасці трапна канстатавалі: *«Кожны край мае свой абычай»* [5, с. 191], *«Што двор, то і нораў»* [В. К. Ярашэвіч], *«Кожнаму свой куток мілы»* [6, с. 59].

Кожнае новае пакаленне выхоўвалася ў адпаведнасці з пэўнымі зменамі, якія адбываліся ў грамадскім жыцці. *«Не пры нас стала, не пры нас пярэйдзе»* [6, с. 470]. Патрабаванне ўліку гістарычных, геаграфічных, этнанацыянальных асаблівасцей, умоў жыццядзейнасці станавілася падмуркам **прынцыпу культураадпаведнасці выхавання**. Па сутнасці, з гэтага прынцыпу і бярэ вытокі фарміраванне такога феномену, як этнічная педагогіка. Менавіта ў яго недаацэнцы бачацца многія сучасныя пралікі ў выхаванні.

Народная афарыстыка беларусаў падмацоўвае педагагічныя высновы, што прыярытэт у выхаванні дзяцей павінен належыць сям'і. **Прынцып прыярытэтнасці сямейнага выхавання** дае вычарпальны адказ на пытанне: «Хто ў першую чаргу нясе адказнасць за выхаванне дзяцей?» Таму народныя клопаты аб узважаных падыходах пры стварэнні сям'і, нараджэнні і выхаванні дзяцей былі найгалоўнейшымі. *«Ажаніцца, як і паміраць, не спяшайся»* [Д. Л. Калацэй], *«Шукай жонку не на йгрышчы, а на ржышчы»* [6, с. 27], *«З тварам да вянца, з розумам да канца»* [Д. Л. Калацэй], *«Броўкі як сярпочкі, а ніўка няжатая стаіць»* [6, с. 261].

Сам шлюбны абрад меў на мэце надаць грамадскую значнасць стварэнню сям'і, закласці падмурак трывалай, дружнай ячэйкі грамадства. Ён утрымліваў мноства яркіх, эмацыянальна насычаных, па-мастацку аздобленых рытуалаў, якія неслі ў сабе непаўторны нацыянальны каларыт і значныя выхаваўчыя магчымасці. Шлюб уключаў у сябе шэраг этапаў: сватанне і агледзіны, заручыны, вянчанне і само вяселле. Усе элементы шлюбнага абраду былі насычаны шматлікімі ўзорамі народнай афарыстычнай творчасці з мэтай надаць значнасць гэтай важнейшай падзеі ў жыцці.

Народная афарыстычная спадчына беларусаў выпрацавала шэраг парад па арганізацыі традыцыйнага ўкладу жыцця. Бясспрэчна, галавой сям'і лічыўся муж, на ім ляжаў абавязак забеспячэння сямейнага дастатку і прыняцця найважнейшых рашэнняў па арганізацыі працы, побыту і адпачынку. Жонка была яго памочніцай, захавальніцай сямейнага ладу. Хоць аўтарытэт сям'і, яе членаў і вызначаўся мужам (*«За сокалам і варона сакаліца»* [6, с. 63], *«Пад*

*добрым кустом трава зелянее, за добрым мужам жонка маладзее»* [6, с. 62]), але ж ад жонкі таксама залежала немала (*«Там і Бог раюе, дзе жонка мужыка шануе»* [6, с. 66], *«У добрай жонкі дрэннага мужа не бывае»* [Д. Л. Калацэй]. Ідэальны варыянт і для арганізацыі шчаслівага жыцця, і для выхавання дзяцей у поглядах беларускага народа – дружная, працавітая сям'я: *«Нашто клад, калі ў сям'і лад»* [6, с. 40], *«Дзе няма згоды, там няма ладу»* [6, с. 40].

У народзе лічылі, што асноўнай функцыяй сям'і з'яўляецца нараджэнне дзяцей і іх гадаванне. *«Без дзяцей ціха, ды на старасці ліха»* [З. Я. Кадол], *«Хата без дзяцей – магіла»* [6, с. 113], *«Гадуй, маці, дзеці, будзеш шчасце меці»* [6, с. 113]. Грамадскай думкай фарміравалася імкненне сям'і мець многа дзяцей: *«Багат Аўдзей, поўна хата дзяцей»* [6, с. 115], *«Адзін сын – не сын, два сыны – паўсына, тры сыны – сын»* [6, с. 117], *«У каго дочак сем, то ёсць доля ўсем, а ў каго адна – то і тая долі жадна»* [5, с. 135]. Разам з тым народная мудрасць папярэджвала: *«Умеў дзіця радзіць, умей і вучыць»* [6, с. 132], *«Дзетак узгадаваць – не курак пасклікаць»* [6, с. 132].

Педагагічная афарыстыка беларусаў ускладвала на бацькоў адказнасць за выхаванне дзяцей і адначасова патрабавала ад дзяцей павагі да бацькоў, удзячнасці і шанавання. Адступленне ад такіх арыентацый выклікала рашучае асуджэнне: *«Бацька і маці ад Бога ў хаце, хто іх зневажае, дабра не знае»* [5, с. 114], *«Адсохне хай тая рука, што на бацьку падымаецца»* [5, с. 113], *«Хто бацькоў не слухае, той у пальцы дзьмухае»* [5, с. 138]).

Агульнапрызнана, што ў беларусаў у параўнанні з многімі іншымі народамі з даўніх часоў жанчына мела досыць высокі статус. У многім дзякуючы мацярынскай любові і выхоўваліся адпаведныя рысы тыповага беларуса – незлаблівасць, міралюбнасць, ціхмянасць, паслухмянасць, спагадлівасць, бо *«Маці сама не з'есць, а дзіцё накорміць»* [6, с. 118], *«Як дзіця плача, маткі сэрца з жалю скача»* [6, с. 114], *«Матка крэпка замахне, а памаленечку вытне»* [Т. П. Гусак].

Пры гэтым і выхаваўчая дзейнасць бацькоў, і вынікі сямейнага выхавання і навучання, і паводзіны дзяцей ацэньваліся, кантраляваліся і карэкціраваліся грамадскай думкай: *«З мамінае песні засмяяўся – як без галавы застаўся»* [5, с. 114], *«Добрае дзіця бацькоў думкі згадвае»* [5, с. 118], *«У таго сям'я, у каго ёсць каму араць, касіць і песню запяваць»* [5, с. 136].

Прызнаннем выхаваўчых заслуг простай беларускай сям'і з'яўляўся **звычай дзядзькавання**, які ўкараніўся ў грамадскае жыццё к канцу XVI ст. і быў распаўсюджаны аж да канца XIX ст. Сутнасць яго заключалася ў тым, што дзеці заможнай шляхты аддаваліся на выхаванне ў звычайную сялянскую сям'ю з мэтай фарміравання ў маладых шляхціцаў лепшых фізічных і духоўных якасцей простага народа.

Патрабаванне сувязі выхаваўчых працэсаў з жыццём абумоўлівала неабходнасць **дзейнаснага характару народнага выхавання**. Традыцыйная педагогіка падводзіла да высновы, што развіццё асобы найбольш эфектыўна будзе адбывацца ў ходзе маральна-практычнай дзейнасці: *«Словамі сцяну не праб'еш»* [Т. П. Гусак], *«Больш рабі, а менш гавары»* [Д. Л. Калацэй], *«Тады слова – серабро, калі справы – золата»* [В. К. Ярашэвіч].

У сваю чаргу дзейнасны характар выхавання прадугледжваў **актыўнасць выхаванцаў ва ўласным развіцці**: *«Пад ляжачы камень вада не цячэ»* [5, с. 92], *«І вада застаялая гіне»* [5, с. 189], *«Калі дроў не падпаліш, то не будуць гарэць»* [9, с. 582].

**Прынцып патрабавальнасці да дзяцей** у працэсе выхавання вылучаецца ў народна-выхаваўчай сістэме ў самастойны выхаваўчы прынцып, які дапамагае індывіду перавесці нормы і правілы грамадскай маралі ва ўнутраную патрэбнасць паводзіць сябе адпаведным чынам. У народзе разумелі, што бацькоўская любоў, натуральная па сваёй прыродзе, часта перарастае ў пеставанне дзяцей, патаканне іх капрызам. Таму павучалі, што *«з пестуна нічога не будзе»*. Былі выпрацаваны педагагічныя пастулаты: *«Хто на дзяцей вяроўку шкадуе, той на сябе вяроўку гатуе»* [В. К. Ярашэвіч], *«Дай дзецям волю, то сам улезеш у няволю»* [5, с. 117], *«Калі матка сына балуе, пятлю на шыю гатуе»* [5, с. 123]. Але ж народная мудрасць перасцерагала і ад празмернай суровасці ў выхаванні дзяцей: *«Не біце дубцамі, навучайце слаўцамі»* [6, с. 125], *«Не біце вяроўкамі, навучайце гаворкамі»* [6, с. 125]. Адначасова народна-педагагічная думка засяроджвае ўвагу на тым, што цеплыня, любоў, ласка ў адносінах з дзецьмі прынясуць найлепшыя выхаваўчыя вынікі: *«Ласкай душу дастане»* [В. К. Ярашэвіч], *«З мядком і цвік праглынеш»* [З. Я. Кадол], *«Ад дубцоў дурнеюць, ад слоўцаў разумнеюць»* [6, с. 112].

Пры гадаванні дзяцей вельмі важна, каб выхаваўчыя патрабаванні былі **даступнымі і зразумелымі**, каб ускладняліся паступова. *«Меней укусіш – лягчэй глынеш»* [Д. Л. Калацэй], *«Разумны вучыць не спяшаецца»* [6, с. 149], *«Ціхая вада берагі падмывае»* [М. П. Тамашова].

Адзначаныя прынцыпы выхавання рэгулявалі характар і структуру гэтага працэсу. З іх дапамогай эфектыўнасць народнага выхавання дасягала значнага ўзроўню.

**(Заканчэнне будзе)**

ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫ ЧАСОПІС

10 / 2011

# Народная Асвета



- ☑ **СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ:** ІНФАРМАЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА АСОБЫ
- ☑ **ІНАВАЦЫЙНАЯ ПЛЯЦОЎКА:** СЕМІНАР-РЭФЛЕКСІЯ «МЕТАД ПРАЕКТАЎ»
- ☑ **АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ ПАРТФЕЛЬ:** АТЭСТАЦЫЯ ПЕДАГАГІЧНЫХ КАДРАЎ
- ☑ **ПЕДАГАГІЧНАЯ АСАМБЛЕЯ:** РАЗУМНАЯ ШКОЛА – ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАЯ ШКОЛА

# АФАРЫСТЫЧНАЯ ЭТНАПЕДАГОГІКА БЕЛАРУСАЎ

## Выхаваўчы сэнс народных парэмій

**(Заканчэнне. Пачатак у № 8, 9)**



**В. С. Болбас,**
першы прарэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна, кандыдат педагагічных навук

### Кандэнсат мудрасці пакаленняў

На працягу многіх стагоддзяў беларускі народ выпрацаваў шмат форм, метадаў і сродкаў выхавання, дзейснасць і выніковасць якіх выверaны і апрабаваны жыццём і часам. У гэтай сістэме пачэснае месца належыць вуснай народнай творчасці. У ёй у сваю чаргу, як адзначалася вышэй, асобна вылучаюцца **афарыстычныя жанры фальклору як найважнейшыя сродкі народнага выхавання**.

Асабліва яскрава праяўляецца афарыстычны патэнцыял вуснай народнай творчасці ў прыказках і прымаўках, якія не без падстаў называюць народнымі педагагічнымі мініяцюрамі. У іх адлюстраваны практычна ўвесь сацыяльна-гістарычны вопыт народа, яго светапогляд, набыткі духоўнай культуры, філасофія быцця.

Знешне простыя, без усялякай прэтэнзіі на красамоўства прыказкі і прымаўкі глыбінёй думкі, сілай абагульнення на ўзроўні, які даходзіць часам да магічнасці, выклікаюць неапісальную гаму асацыяцый, пачуццяў. **Беларускія прыказкі і прымаўкі** заснаваны на жывой гутарковай мове («*Мова без прыказкі – як ежа без солі*» [М. П. Тамашова]).

Практычна ўсе яны маюць афарыстычную форму і павучальны змест, які ўяўляе сабой кандэнсат усяго самага каштоўнага, выпрабаванага жыццём і часам з выхаваўчай практыкі многіх пакаленняў. У сціслай, але вобразнай форме прыказкі і прымаўкі вельмі трапна і даходліва даносяць асобныя ідэі народнай педагагічнай думкі. Мноства народных афарызмаў створаны аднарадковымі: «*Дзеля дроў замуж пайшла*» [5, с. 117], «*Багацце нявесты на шчасце не пераробіш*» [5, с. 113], «*Добры чалавек у чужы агарод дрэні не выкідае*» [5, с. 118].

У двухрадковых педагагічных мініяцюрах другая палавіна звычайна шляхам супрацьпастаўлення ўзмацняе галоўную сэнсавую сутнасць і агульную выхаваўчую інтэнцыю прымаўкі: «*Датуль матка міла, пакуль ножкі мыла*» [5, с. 117], «*Бацька з маткаю на рабоце не томяцца, калі з дзетак сваіх цешацца*» [5, с. 113], «*Калі на свет дзіця прыходзіць, новы кусок хлеба родзіць*» [5, с. 123].

Шматступенныя, шматрадковыя парэміі шляхам паўтораў засяроджваюць увагу выхаванца на галоўнай ідэі прымаўкі: «*Не дзяржы дзяцей пры сябе, бо спесцяцца, разлянуюцца, а аддай іх лепей у навуку, каля людзей цатруцца рабоце навучацца*» [В. К. Ярашэвіч], «*Вось праўду кажуць: да дваццаці пяці гадоў хлопец сам жэніцца, з дваццаці пяці да трыццаці – людзі, а пасля сам чорт не ажэніць*» [5, с. 115], «*Дзве пілы ў хаце: адной сам дрэва рэжа, а другая – яго самога пілуе*» [5, с. 117].

Выхаваўчы патэнцыял прыказак і прымавак істотна павялічваецца трапным выкарыстаннем гіпербал, літот, спецыяльным, падчас непамерным узвелічэннем або прымяншэннем асобных жыццёвых з'яў і момантаў дзеля засяроджання ўвагі на пэўных якасцях ці сітуацыях: «*Мурашка малая, а горы капае*» [5, с. 87], «*Вочы па яблыку, а галава з арэх*» [6, с. 205], «*Слоў мяшок, а спраў на вяршок*» [6, с. 281].

Народная мудрасць асабліва ўдала ўжывае метафару як форму іншасказальнай вобразнасці, заснаванай на сходнасці двух з'яў: «*Не п'яны плача, а гарэлка*» [6, с. 357], «*Пакой п'е воду, а непакой – мёд*» [6, с. 305], «*Ліхаманка трасець, а ў карчму грошы нясець*» [6, с. 354].

Асабліва часта ў народзе звярталіся да іроніі, каб у далікатнай форме высмяяць негатыўныя з'явы і адмоўныя якасці: «*Пакуль гром не загрыміць, мужык не перажыгнецца*» [В. К. Ярашэвіч], «*Тады чалавек памысліць мусіць, як свая вош укусіць*» [М. П. Тамашова], «*Як п'ян, што мне пан? А як расплюся, і свінні баюся*» [З. Я. Кадол].

Прыказкі і прымаўкі вызначаюцца багатым асацыятыўным зместам, таму амаль кожную з іх можна выкарыстоўваць у самых розных жыццёвых сітуацыях. Мнагазначнасць зместавых нюансаў у сукупнасці са сціслацю формы, згушчанасцю думкі выклікае пэўныя цяжкасці пры расшыфроўцы сэнсу выяўлення сутнаснага напаўнення афарыстычных сродкаў выхавання.

Падыходы народнай педагогікі характарызуюцца значнай пластычнасцю, гнуткасцю, шматварыятыўнасцю. Тут мірна ўжываюцца, здавалася б, такія процілеглыя пастулаты, як: «*Ласкыю скорей дапросисься, дошлесься и старыва и малыва*» і «*Любі дзіця як душу, а калаці як грушу*» [М. П. Тамашова]. У народзе вельмі тонка разумелі магчымасці прымянення тых ці іншых метадаў або сродкаў выхавання. Было прыкмечана, што адзін і той жа сродак у залежнасці ад розных умоў можа даць зусім супрацьлеглыя вынікі. Слынны айчынны педагог XVII ст. Сімяон Полацкі пісаў: «Коса о

камень может ся тупити, но мечь камнем может ся острити» [12, с. 269].

### Народныя загадкі

Трапнасцю афарыстычнага выказвання, лапідарнасцю формы, сканцэнтраванасцю жыццёвага вопыту, мастацкасцю сродкаў выразнасці блізка да прыказак і прымавак знаходзяцца **народныя загадкі**: «*Пяць раз гарэў, адзін раз строіўся*» (пяць дачок замуж аддаваў і аднаго сына жаніў) [8, с. 276], «*Два арлы арлуюць, чужое яечка балуюць*» (кум, кума і дзіця) [8, с. 279], «*У лесе расло, цяпер носіць душу і цела*» (калыска) [8, с. 226].

У загадках адлюстраваны практычна ўвесь гістарычна-жыццёвы вопыт народа, яго веданне навакольнага свету. Праз загадкі народ паказвае ўзоры творчай фантазіі, кемлівасць, нестандартнасць мыслення, трапнасць гумару, лаканічнасць мовы, паэтычныя здольнасці. Тым самым вызначаюцца значныя педагагічныя магчымасці гэтага жанру фальклору.

Яркая метафарычная вобразнасць, рытмічны лад і рыфма часам амаль сціраюць жанравыя межы, і некаторыя загадкі пераўвасабляюцца ў прыказкі, а прыказкі наадварот у загадкі: «*Ваўкі вала з'елі, толькі хвост пакінулі*» (разабраны стог сена); «*Сям'я багата, ды два локці хата*» (вулей).

Праз загадкі народная мудрасць прыпадносіць нам багацце назапашанага гістарычнага вопыту, уяўленняў аб жыцці – ад канкрэтнай рэчаіснасці да будовы сусвету. «*Вышэй аблакоў чырвоная птушка лятае*» (сонца) [8, с. 21], «*Зароў вол на сем сёл*» (гром) [8, с. 36], «*Паўзун паўзе і іголкі вязе*» (вожык) [8, с. 137].

Афарыстычная скарбонка беларусаў утрымлівае значную колькасць твораў вуснай народнай творчасці, якія фарміравалі станоўчыя адносіны да ведаў, адукаванасці, кнігі: «*Белае поле, чорнае семя, хто яго сее, той разумнее*» (кніга, пісьмо) [8, с. 284], «*Расчыніцца ночка – глянуць з яе лісточкі, хто іх разглядае, той многа пазнае*» (кніга) [8, с. 285], «*Росту малога, стану пякнога, хто яе знае, той розум мае*» (кніга) [8, с. 285], «*Быў сабе дурань, на дошку дзівіўся, зрабіўся разумны*» (кніга) [8, с. 285].

Для загадкі як аднаго з самых старажытных сродкаў выхавання характэрна скіраванасць на развіццё мыслення, памяці, кемлівасці, эстэтычнага густу. Г.Н. Волкаў сцвярджае: «Загадкі разумны, высокапаэтычны, многія нясуць у сабе маральную ідэю» [3, с. 79]. Загадкі асабліва актыўна стымулююць дзіцячую фантазію, творчасць, развіваюць мастацка-паэтычны погляд на звычайныя рэчы і з'явы навакольнага свету. Сучасныя педагогі адзначаюць, што дзяцей, у выхаванні якіх актыўна выкарыстоўваліся народныя загадкі, «лягчэй навучыць разуменню паэзіі, творчасці наогул, успрыманню абстрактных катэгорый» [14, с. 76]. Загадкі нясуць у сабе істотны асветны патэнцыял. У іх утрымліваюцца звесткі аб прыродзе, яе з'явах, грамадстве, розных праявах чалавечага быцця. У працэсе разгадвання выхаванцы вучацца параўноўваць прыметы розных прадметаў і з'яў, знаходзіць істотнае, агульнае. Тым самым закладваюцца асновы тэарэтычнага творчага мыслення.

Некаторыя загадкі маюць выражаную дыдактычную скіраванасць. Напрыклад, матэматычныя задачы-загадкі: «*Дваццаць без пятнаццаці, трох не далажыўшы, двух не далічыўшы. Колькі будзе?*» (нічога) [8, с. 314], загадкі геаграфічнага накірунку: «*Чаму ў Парыжы сена не сохне?*» (рака Сена) [8, с. 313], філалагічна арыентаваныя загадкі: «*Палавіна якой літары засейваецца хлебам*» (Е (пол-е) [8, с. 313].

Шэраг загадак на досыць высокім узроўні абстрагавання вучаць лагічнаму мысленню («*Ляцелі галкі, стаялі палкі. Як сядуць яны па адной – галка лішняя, як сядуць яны па дзве – палка лішняя. Колькі было галак і колькі палак*» (тры палкі і чатыры галкі) [8, с. 315], шырыні кругагляду («*Што даражэй за ўсё на свеце*» [8, с. 313]). Каб абудзіць цікавасць да разгадвання загадак, некаторыя з іх пададзены ў выглядзе жартаў: «*Што бывае пасля сямі гадоў?*» (восьмы) [8, с. 312]. Загадкі развіваюць назіральнасць дзяцей, вобразнае мысленне, хуткасць разумовых рэакцый.

### Накіраваныя на падсвядомасць

У беларусаў, як і ў іншых усходніх славян, шырока распаўсюджаны і маюць сапраўдную разгалінаваную сістэму **клятвы**, **пажаданні дабра** і **зла**. У традыцыйным укладзе жыцця яны выконвалі важную выхаваўчую ролю. Пажаданні дабра, дастатку, шчасця, якія існавалі на ўсе моманты жыцця, часта трансфармаваліся ў формы прывітання: «*Будзь-на весел, як сват на вяселлі, здароў, як вада, багат, як зямля*» [9, с. 182], «*Вам шчасця-долю і хлеба ўволю!*» [9, с. 183], «*Каб вы заўсёды мелі, уволю спажывалі і бедных надаралі*» [9, с. 184].

Вера ў сілу такіх пажаданняў фарміравала адпаведны настрой, уздымала веру чалавека ў асабістую значнасць і будучую ўдачлівасць. Як правіла, пажаданні выказваліся ў рашаючыя моманты жыцця, што значна ўзмацняла іх выхаваўчае, псіхатэрапеўтычнае ўздзеянне. Невыпадкова моладзь імкнулася перад прыняццем адказных рашэнняў атрымаць блаславенне старэйшых, бацькоў: «*Благаслаўляю цябе, дзіцятка, на ўсё добрае, а на благое і сам дагадаешся*» [9, с. 182].

Нашы продкі шчыра верылі ў стымулюючы і ахоўны патэнцыял пажаданняў, якія прадвызначалі станоўчы зыход пэўнай дзейнасці, а то нават і праграміравалі сам лёс чалавека. Усё гэта глыбока пранікала ў падсвядомасць, надавала аптымізм і садзейнічала поспеху ў справах.

Значныя выхаваўчыя магчымасці маюцца ў клятвах: «*Клянусё табе дзецьмі сваімі!*» [9, с. 198], «*Клянусь табе сонцам праведным!*» [9, с. 198], «*Як перад Богам клянуся!*» [9, с. 199]. У народзе існавала цвёрдае перакананне, што парушэнне клятвы – гэта вельмі цяжкі грэх, які наклікае шматлікія беды і няшчасці. Прытрымліванне ўмоў клятвы маральна гартавала асобу, засцерагала ад непажаданых учынкаў, арыентавала на адпаведныя паводзіны. Так, вывучаючы ў XIX ст. культуру і побыт на беларускім Палессі, І.А. Сербаў

адзначаў, што «калі палешук даў клятву і пры гэтым прылажыў руку да сэрца, то ніякая сіла не прымусіць парушыць яе» [15, с. 59].

Удумлівага аналізу і адпаведнай ацэнкі патрабуе разгляд пажаданняў зла як аднаго са сродкаў выхавання: «*Каб цябе лепш хвароба ўзяла!*» [9, с. 224], «*Каб цябе на пасад не садзілі*» [9, с. 224], «*Каб цябе святая зямля не прыняла!*» [9, с. 226], «*Каб яму Бог здароўя не даў!*» [9, с. 228]. Канструкцыйна такія пажаданні аналагічныя пажаданням дабра, але тут звяртаюцца да супрацьлеглых з'яў і вобразаў: няшчасце, хвароба, смерць, беднасць і г.д. Рэзка негатыўная скіраванасць такіх выказванняў, прасякнутая адмоўнай экспрэсіяй, выклікала прымхлівы страх. Як правіла, да іх выкарыстання даходзілі ў эмацыянальна-ўзбуджаным стане.

У процівагу пажаданням дабра праклёны неслі магутны негатыўны пасыл і, як скальпель хірурга, калі не дапамагалі іншыя тэрапеўтычныя сродкі, прымяняліся для выкаранення ўсяго антыграмадскага, амаральнага: «*Няхай таму займе мову, хто на мяне па несправядлівасці брэша!*» [9, с. 231], «*Няхай той есці не хоча, хто чужога дабра хоча*» [9, с. 231], «*Хай таму дзіцятку язык адваліцца, калі на людзях бацьку няславіць*» [9, с. 236]. Сама верагоднасць атрымаць праклён служыла магутным перасцерагальным пачаткам. Самым страшным і практычна недапушчальным лічыўся бацькоўскі праклён. Страх перад праклёнам карэкціраваў паводзіны, ставіў заслон перад негатыўнымі дзеяннямі і нават думкамі.

Чалавечнасць, гуманізм афарыстычнай этнапедагогікі беларусаў праяўляецца ўжо ў тым, што выказванне добрых пажаданняў усямерна ўхвалялася, а ўжыванне праклёнаў было абмежавана мноствам усемагчымых забарон, перасцярог. Даходзіць да праклёнаў дапускалася грамадскай думкай у крайніх выпадках. Лічылася, што напрасны праклён не «прыстае да адрасата», а вяртаецца на таго, хто яго вымавіў.

**Рэзюмэ аўтара**

Нават сціслы аналіз педагагічных ідэй афарыстычнай творчасці беларусаў паказвае яе сістэмны характар, дапамагае далучыцца да ўнікальнага феномену – беларускай этнапедагагічнай культуры. Этнічная педагогіка сваім існаваннем у многім абавязана вусна-паэтычнай і ў прыватнасці афарыстычнай народнай творчасці, якія з'яўляюцца непісаным падручнікам, адшліфаваным і выпрабаваным жыццём і часам. Усе народна-педагагічныя ідэі патрабуюць далейшага вывучэння, але асаблівая ўвага павінна быць нададзена іх творчаму выкарыстанню ў сучаснай школе. Выразныя па змесце і акрэсленыя па форме афарыстычныя творы вызначаюць мэты, змест, прынцыпы, метады, сродкі і формы народнага выхавання. Сучаснае іх прызначэнне, па-першае, заключаецца ў абагачэнні тэарэтычных палажэнняў педагагічнай тэорыі, па-другое, у іх шырокім ужытку пры арганізацыі як навучальнага, так і выхаваўчага працэсаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Большая советская энциклопедия**: в 30 т. / гл. ред. А.М. Прохоров. – М.: Сов. энц., 1975. – Т. 20. – 608 с.
2. **Краткая литературная энциклопедия**: в 9 т. / под ред. А. А. Суркова. – М.: Сов. энц., 1968. – Том 5: Мурари – Припев. – 976 с.
3. **Арлова, Г. П.** Беларуская народная педагогіка / Г. П. Арлова. – Мінск: Нар. асвета, 1993. – 120 с.
4. **Гусоўскі, М.** Песня пра зубра: на лацін., белар., рус. мовах / М. Гусоўскі. – Мінск: Маст. літ., 1980. – 192 с.
5. **Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы** / скл. Ф. Янкоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.
6. **Прыказкі і прымаўкі**: у 2 кн. / скл. М. Я. Грынблат. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 2. – 616 с.
7. **Порецкий, Я. И.** Соломон Рысинский: Salomo Pantherus Leucorussus: конец XVI – нач. XVII в. / Я. И. Порецкий. – Минск: Изд-во БГУ, 1983. – 158 с.
8. **Загадкі** / скл. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі; 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 363 с.
9. **Выслоўі** / склад. М. Я. Грынблат. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 520 с.
10. **Аксамітаў, А.** Прыказкі і прымаўкі: тлумач. слоўн. бел. прыказак і прымавак з арх., кафедр. збораў, рэд. выд. XIX і XX стст. / А. Аксамітаў; 2-е выд., дапрац. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 320 с.
11. **Пяткевіч, Ч.** Рэчыцкае Палессе / Ч. Пяткевіч. – Мінск: Бел. кнігазбор, 2004. – 672 с.
12. **Полоцкий, С.** Вирши / С. Полоцкий; сост., подгот. текстов, вступит. ст. и комм. Б. К. Былинина, Л. У. Звонарева; научн. ред. В. Г. Короткий. – Минск: Маст.лит., 1990. – 447 с.
13. **Волков, Г. Н.** Этнопедагогика / Г.Н. Волков. – Чебоксары: Чувашск, книжн. изд-во, 1974. – 376 с.
14. **Цаллагова, З. Б.** Этнопедагогическая афористика / З.Б. Цаллагова // Этнографическое обозрение. – 2000. – № 5. – С. 70–79.
15. **Сербов, И. А.** Белорусы-сакуны: краткий этнографический сборник / И. А. Сербов. – СПб.: Тип. Императорской Академии Наук, 1915.